**Мікалай Мязга**
(Гомель)

# Праблема нацыянальных меншасцей у савецкай палітыцы ў дачыненні да Польшчы ў першай палове 1920-х гадоў

Пасля завяршэння вайны 1919-1920 гадоў паміж Савецкай Расіяй і Польшчай граніца паміж імі была праведзена такім чынам, што на тэрыторыі савецкіх рэспублік апынулася значная польская нацыянальная меншасць, а на тэрыторыі Польшчы — дастаткова шматлікае ўкраінскае і беларускае насельніцтва. У дадзеным артыкуле мы ставім задачу высветліць, якую ролю адводзіла савецкае кіраўніцтва нацыянальным меншасцям у Польшчы ў сваёй палітыцы ў дачыненні да гэтай краіны ў першыя гады пасля заключэння Рыжскага дагавора. З сярэдзіны 1920-х гадоў значэнне гэтай праблемы ў савецка-польскіх адносінах істотна зніжаецца, чым і абумоўленыя храналагічныя рамкі артыкула. Прыступаючы да разгляду азначанай праблемы, неабходна ўлічваць, што пасля Рыжскага міру савецкае кіраўніцтва працягвала разглядаць Польшчу як аднаго з асноўных, калі не асноўнага, праціўніка на міжнароднай арэне.

Як вядома, артыкул 7 Рыжскага мірнага дагавора прадугледжваў гарантыі правоў нацыянальных меншасцей на тэрыторыі дзяржаў, якія яго падпісалі. Ва ўказаным артыкуле гаворка ішла аб свабодзе рылігійных культаў, магчымасці развіваць адукацыю на роднай мове, нацыянальную культуру[1]. Савецкае кіраўніцтва спрабавала выкарыстоўваць гэтыя палажэнні Рыжскага дагавора для таго, каб час ад часу аказваць ціск на Польшчу, а сябе прадстаўляць у якасці абаронцы правоў беларусаў і ўкраінцаў у Польшчы. Прычым ва ўказным напрамку дзейнічаў не толькі расійскі цэнтральны ўрад, але часам і ўрады іншых зацікаўленых савецкіх рэспублік.

Ужо 21 жніўня 1921 г. урад БССР накіраваў ураду Польшчы ноту пратэсту ў сувязі з парушэннем правоў беларускага насельніцтва на тэрыторыі Польшчы. У ёй прыводзяцца канкрэтныя факты закрыцця беларускіх школ, збіцця сялян паліцыяй, забароны на стварэнне кааператываў, запіс беларусаў палякамі па нацыянальнасці[2]. Урады РСФСР, затым СССР, таксама ў далейшым перыядычна звярталіся да ўрада

[1] *Документы и материалы по истории советско-польских отношений* (далей: ДМИСПО), т. 3, Москва 1965, с. 527-528.
[2] ДМИСПО, т. 4, с. 56-57.

Польшчы з аналагічнымі нотамі. Аднак, трэба прызнаць, што рабіў гэта савецкі бок адносна рэдка. Толькі амаль праз год, 21 чэрвеня 1922 г., часовы паверанаы ў справах РСФСР у Польшчы Леанід Абаленскі ўручыў польскаму міністру замежных спраў Канстанціну Скірмунту ноту, у якой гаворка ішла аб праблеме беларускай і ўкраінскай нацыянальных меншасцей у Польшчы. Прычым яна з'явілася як адказ на польскую ноту савецкаму ўраду ад 13 чэрвеня 1922 г. У ёй урад Польшчы абвінавачваў мясцовыя органы ўлады БССР у арганізацыі і падтрымцы партызанскага руху на тэрыторыі „ўсходніх крэсаў". Так што ініцыятыва абмеркавання пытання аб нацыянальных меншасцях летам 1922 г. належала не савецкаму, а польскаму боку. Савецкае кіраўніцтва звязвала разгортванне партызанскага руху ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне з ажыццяўляемай польскімі ўладамі палітыкай сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечання ў дачыненні да нацыянальных меншасцей[3].

Дыпламатычная перапіска па гэтай праблеме летам 1922 г. мела працяг. Польскі ўрад у наступнай ноце абвінаваціў Савецкую Расію ў невыкананні артыкула 7 Рыжскага дагавора ў частцы свабоды адпраўлення рэлігійных культаў. Савецкая нота ў адказ ад 22 ліпеня адвяргала гэтыя абвінавачванні. У той жа час савецкі ўрад указваў на ганенні і праследаванні на тэрыторыі Польшчы ў дачыненні да праваслаўнага насельніцтва як на парушэнне артыкула 7 Рыжскага дагавора[4]. Абмен нотамі прадэманстраваў, што бакі па-рознаму трактуюць артыкул 7 Рыжскага дагавора. У дадзеным артыкуле мы не ставім у якасці задачы аналіз савецкай палітыкі ў дачыненні да Каталіцкага касцёла на тэрыторыі савецкіх рэспублік. Адзначым толькі, што савецкая трактоўка артыкула 7 Рыжскага дагавора прадстаўляецца нам дастаткова абгрунтаванай. У ім сапраўды гаворка ідзе толькі аб карыстанні маёмасцю ў мэтах ажыццяўлення рэлігійнага культу, а не аб перадачы яе ва ўласнасць рэлігійным абшчынам. Да таго ж ва ўзгаданым артыкуле ўказваецца на прыярытэт нацыянальнага заканадаўства ў вырашэнні рэлігійных пытанняў[5]. Але пры гэтым савецкае кіраўніцтва „забывала", што беларуская і ўкраінская нацыянальныя меншасці на тэрыторыі Польшчы маглі карыстацца правамі, прадугледжанымі артыкулам 7 Рыжскага дагавора, у рамках польскага нацыянальнага заканадаўства.

Асабліва актыўны абмен нотамі па гэтым пытанні адбыўся ў маі-чэрвені 1924 г. 10 мая СССР заявіў рэзкі пратэст польскаму ўраду ў сувязі с парушэннем правоў пражываючых у Польшчы ўкраінцаў і бела-

[3] ДМИСПО, т. 4, с. 166.

[4] *Документы внешней политики СССР: в 22 т.* (далей: ДВП СССР), т. 5, Москва 1961, с. 521-529 .

[5] ДМИСПО, т. 4, с. 527-528.

русаў. У савецкай ноце ад 10 мая гаварылася, што матэрыялы і факты, якія маюцца ў распараджэнні Народнага Камісарыята Замежных Спраў (НКЗС) СССР сведчаць пра сістэматычнае парушэнне польскімі ўладамі гарантый, якія нацыянальным меншасцям дае Рыжскі дагавор. У ноце прыводзіліся шматлікія факты рэпрэсій польскіх улад у дачыненні да насельніцтва Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. У заключэнні ноты савецкі ўрад канстатуе, што выкананне артыкула 7 Рыжскага дагавора з'яўляецца неабходнай умовай добрасуседскіх адносін паміж СССР і Польшчай[6].

Характэрна, што практычна адначасова з савецкай нотай па праблеме нацыяльных меншасцей польскім урадам 14 мая была атрымана германская нота па той жа тэматыцы. Яна датычылася правоў нямецкай меншасці ў польскай частцы Сілезіі. Сумеснае выступленне Масквы і Берліна ў абарону правоў нацыянальных меншасцей на тэрыторыі Польшчы дало падставы польскаму ўраду чарговы раз гаварыць аб антыпольскай савецка-германскай змове. Савецкі прадстаўнік у Варшаве паведамляў, што ў польскіх правячых колах сфарміравалася перакананне аб існаванні паміж СССР і Германіяй пагаднення па польскім пытанні, і ноты аб становішчы нацыянальных меншасцей з'яўляюцца першым агрэсіўным крокам з іх боку[7].

Польскі ўрад у ноце ў адказ 15 мая адкінуў савецкія прэтэнзіі як умяшанне ва ўнутраныя справы Польшчы. Далей нота ўтрымлівала надзвычай жорсткі тэзіс аб парушэнні правоў чалавека ў СССР: „Польскі ўрад не можа не выказаць свайго здзіўлення адносна таго, што Савецкі ўрад выступае адносна нібыта падвяргаючыхся ўціску ў Польшчы грамадзянскіх свабод і рэлігійных перакананняў нацыянальных меншасцей у той час, калі грамадзяне Савецкага Саюза, належачыя як да нацыянальных меншасцей, так і нацыянальных большасцей саюзных рэспублік, гэтых свабод пазбаўлены". Польскі ўрад таксама заяўляў, што ў будучым ён будзе пакідаць без адказу „ўсе неабгрунтаваныя і недапушчальныя прэтэнзіі Савецкага ўрада, якія датычацца артыкула 7 Рыжскага дагавора". У заключэнні Польшча падкрэслівала неабходнасць дакладнага і лаяльнага выканання Рыжскага дагавора[8].

Савецкае кіраўніцтва не пакінула без увагі вельмі рэзкі тон польскай ноты ад 15 мая, што наклала адбітак на змест ноты, якую народны камісар замежных спраў СССР уручыў пасланніку Людвіку Дароўскаму 23 мая 1924 г. У ёй звяртаецца ўвага на тое, што факты парушэння правоў нацыянальных меншасцей, прыведзеныя савецкім бокам, польскі ўрад

[6] ДМИСПО, т. 4, с. 292-297.

[7] Архив внешней политики Российской Федерации (далей: АВПРФ), ф. 04, оп. 32, п. 214, д. 52604, л. 49.

[8] ДМИСПО, т. 4, с. 298.

так і не змог абвергнуць, „што з'яўляецца пацвярджэннем абгрунтаванасці заяў, вылучаных савецкім бокам". Таксама падкрэслівалася, што артыкул 7 Рыжскага дагавора дае саюзнаму ўраду фармальнае права аховы правоў нацыянальных меншасцей ў Польшчы шляхам патрабавання ад польскага ўрада яго дакладнага выканання. Далей у савецкай ноце зроблена спроба падвесці вынік дыскусіі аб правах нацыянальных меншасцей: „Заява польскага ўрада аб тым, што ён будзе пакідаць без увагі ўсялякія дамаганні Саюзнага Урада па артыкуле 7 Рыжскага дагавора, Саюзны Урад можа трактаваць толькі як доказ таго, што, на думку Польскага Урада, не ўсе артыкулы Рыжскага дагавора падлягаюць выкананню. Такі пункт гледжання Польскага Урада Саюзны Урад прымае да ведама"[9]. Прыведзеная фраза прыадкрывае адну з мэт, да якой імкнуўся савецкі ўрад, уздымаючы пытанне аб невыкананні Польшчай артыкула 7 Рыжскага дагавора: знайсці абгрунтаванне для невыканання тых палажэнняў Рыжскага дагавора, якія былі нявыгадныя для СССР.

Спроба савецкага ўрада паставіць пад сумненне выкананне Рыжскага дагавора выклікала хуткую і рэзкую рэакцыю з боку Польшчы. У ноце ад 27 мая польскі ўрад нагадвае Маскве аб узаемных абавязацельствах, якія накладае артыкул 7 Рыжскага дагавора і аб тым, што гэтыя абавязацельствы павінны ўзгадняцца з унутраным заканадаўствам. Варшава таксама падкрэслівала, што ўсе пастановы Рыжскага дагавора павінны быць дакладна і лаяльна выкананы абодвума бакамі[10].

Нотная перапіска паказала, што бакі па-ранейшаму па-рознаму трактуюць артыкул 7 Рыжскага дагавора. Урад СССР лічыў, што гэты артыкул дае яму права выступаць у ролі абаронцы правоў нацыянальных меншасцей у Польшчы. Польскі ж урад разглядаў такія памкненні савецкага боку як умяшанне ва ўнутраныя справы Польшчы і рашуча адкідаў іх. Пры гэтым Масква ў той момант ставіла ў залежнасць ад выканання артыкула 7 Рыжскага дагавора агульнае развіццё савецка-польскіх адносін. Мы ўбачым, што далей пазіцыя СССР па гэтым пытанні зменіцца. Савецкае кіраўніцтва прызнае бесперспектыўнасць сілавога ціску на Польшчу ў справе абароны правоў беларусаў у Польшчы. Ужо 18 кастрычніка 1924 г. Георгій Чычэрын у выступленні на 2-й сесіі ЦВК СССР не прыгадвае праблемы нацыянальных меншасцей у адносінах з Польшчай і гаворыць пра пацяпленне ў савецка-польскіх адносінах[11].

Адыход ад палітыкі ціску на Польшчу ў пытанні аб правах нацыянальных меншасцей выразна бачны з выступлення Гіеоргія Чычэрына на III Усесаюзным з'ездзе саветаў 14 мая 1925 г. Ён адзначыў, што арты-

[9] ДМИСПО, т. 4, с. 309-310.
[10] „Известия", 1924, 10 июня, № 130 (2165).
[11] ДМИСПО, т. 4, с. 334-335.

кул 7 Рыжскага дагавора Польшча не выконвае. Але гэта толькі адно са шматлікіх пытанняў у савецка-польскіх адносінах, і яно можа разглядацца толькі ў сувязі з іншымі пытаннямі. Г. Чычэрын адзначыў, што дабіцца выканання артыкула 7 Рыжскага дагавора з боку Польшчы можна толькі пры ўмове агульнага пацяплення савецка-польскіх адносін: „(...) мы бачым, што гэты артыкул выконваецца тым менш, чым больш абвастраюцца нашы адносіны з Польшчай. Парушэнні гэтага артыкула менш рэзкія тады, калі нашы агульныя адносіны з Польшчай з'яўляюцца менш абвостранымі”[12].

Адной з мэт савецкай палітыкі ў дачыненні да Польшчы было імкненне заваяваць сімпатыі беларусаў і ўкраінцаў, якія жылі на яе тэрыторыі. Дасягненню гэтай мэты былі падпарадкаваны і некаторыя ўнутрыпалітычныя акцыі Масквы, у прыватнасці, рашэнне аб узбуйненні БССР. Пра важнасць міжнароднага фактара пры прыняцці рашэння аб пашырэнні БССР сведчыць тое, што ля яго вытокаў стаяла знешнепалітычнае ведамства СССР. Па ініцыятыве НКЗС СССР 31 мая 1923 г. была створана камісія палітбюро ЦК УКП(б) па пытанні аб рабоце сярод беларусаў у Польшчы. У яе ўвайшлі такія буйныя дзяржаўныя дзеячы, як Г. Чычэрын, Вячаслаў Молатаў, Іосіф Уншліхт. Сярод пытанняў, якія павінна была вырашаць камісія, было і пытанне „(...) аб пашырэнні межаў Беларусі”. Прапановы камісіі былі адобраны на пасяджэнні палітбюро ЦК УКП(б) 12 ліпеня 1923 г. Пашырэнне граніц БССР было прызнана „прынцыпова мэтазгодным”[13]. У выніку 4 лютага 1924 г. ЦВК СССР прыняў рашэнне аб першым узбуйненні БССР.

Пацвярджэннем узаемасувязі гэтага рашэння з развіццём савецка-польскіх адносін можа служыць тэлеграма члена Калегіі НКЗС СССР Віктара Копа савецкаму прадстаўніку ў Варшаве Л. Абаленскаму ад 23 жніўня 1923 г. У ёй адзначалася, што „ў Польшчы дзіўным чынам прайшло зусім не заўважаным наша рашэнне пашырыць граніцы Беларусі на ўсход”. Абаленскі быў абавязаны звярнуць увагу польскай і еўрапейскай грамадскасці на гэты факт. Пры гэтым яму неабходна было супрацьпастаўляць „вызваленчую палітыку Саюза палітыцы прыгнечання нацыянальнасцей у Польшчы”[14]. Пасля таго, як узбуйненне БССР адбылося, для СССР было важна, каб яно выклікала нейкую рэакцыю ў Польшчы. У сакавіку 1924 г. у адказ на запыт з Масквы Л. Абаленскі паведамляў, што польская прэса абышла маўчаннем факт павелічэння тэрыторыі БССР. Дадзеная падзея ўвогуле не прыгадваецца польскімі

[12] ДМИСПО, т. 4, с. 400-401.

[13] У. Ф. Ладысеў, П. І. Брыгадзін, *Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі 1917-1939*, Мінск 2003, с. 149.

[14] АВПРФ, ф. 04, оп. 32, п. 212, д. 52565, л. 23-24.

журналістамі[15]. Гэта не было выпадковасцю, бо для польскіх правячых колаў было відавочна, што распаўсюджванне інфармацыі аб павелічэнні тэрыторыі БССР будзе спрыяць росту сімпатый да яе з боку беларусаў, якія жывуць у Польшчы. Дзмітры Мануільскі ў выступленні на III з'ездзе Камуністычнай партыі Польшчы прама ўказваў, што нацыянальная палітыка СССР з'яўляецца сродкам барацьбы супраць імперыялістычнай Польшчы[16]. З прыведзеных дакументаў бачна, што павялічваючы тэрыторыю БССР у 1924 г., кіраўніцтва СССР зыходзіла ў многім са знешнепалітычных інтарэсаў. Гэтай акцыяй яно хацела прадэманстраваць клопат аб нацыянальных інтарэсах беларусаў, прадставіць сваю нацыянальную палітыку як пазітыўную і супрацьпаставіць яе польскай палітыцы прыгнечання нацыянальных меншасцей.

У 1926 г. кіраўніцтва БССР зноў уздымае пытанне аб узбуйненні рэспублікі. І на гэты раз яно знаходзіць падтрымку ў гэтым пытанні перш за ўсё з боку НКЗС СССР. На яго пасяджэнні ў верасні 1926 г. было прынята рашэнне настойваць перад палітбюро ЦК УКП(б), каб Гомельскі і Рэчыцкі паветы, у якіх маецца безумоўная большасць беларускага насельніцтва, неадкладна далучыць да БССР"[17]. Такую пазіцыю НКЗС СССР адносна ўзбуйнення БССР лагічна звязаць з жорсткай палітыкай польскіх улад у дачыненні да беларускага нацыянальнага руху, асабліва пасля прыходу да ўлады ў маі 1926 г. Юзафа Пілсудскага. Неабходна было прадэманстраваць насельніцтву Заходняй Беларусі, у якой ступені палітыка СССР у дачыненні да беларусаў адрозніваецца ад палітыкі Польшчы. 6 снежня 1926 г. Прэзідыум ЦВК РСФСР юрыдычна аформіў передачу БССР Гомельскага і Рэчыцкага паветаў.

Мэтам аслаблення ўплыву Польшчы на нацыянальных ускраінах у многім была падпарадкавана і дзейнасць Камуністычнай партыі Польшчы. На сваім II з'ездзе ў 1923 г. яна прыняла рэзалюцыю аб праве нацый, якія ўваходзілі ў склад польскай дзяржавы, на самавызначэнне і добраахвотнае далучэнне тэрыторыі той ці іншай нацыі да другой дзяржавы. У партыйных дакументах КП(б)Б тлумачылася, што ў адносінах да беларусаў і ўкраінцаў маецца на ўвазе далучэнне да СССР[18]. Курс на ўваходжанне Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў склад СССР пацвярджае і адзін з заклікаў ЦК КПЗБ да 1 мая 1924 г.: „Няхай жыве аб'яднаная рабоча-сялянская Савецкая Беларусь"[19].

[15] АВПРФ, ф. 04, оп. 32, п. 213, д. 52596, т. 2, л. 4.

[16] Д. Мануильский, *Коммунистическая партия Польши и национальный вопрос. Доклад на III съезде Коммунистической партии Польши*, Москва 1925, с. 43.

[17] У. Ф. Ладысеў, П. І. Брыгадзін, *Паміж Усходам і Захадам...*, с. 158.

[18] Дзяржаўны абласны архіў Брэсцкай вобласці (далей: ДААБВ), ф. 4, воп. 1, спр. 820, арк. 26.

[19] ДМИСПО, т. 4, с. 288.

Прадстаўнікі савецкіх правячых колаў часам адкрыта гаварылі аб непрызнанні ўваходжання Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў склад Польшчы. У красавіку 1924 г. бурную негатыўную рэакцыю ў Польшчы выклікала заява кіраўніка савецкага ўкраінскага ўрада Грыгорыя Пятроўскага, які падкрэсліў, што паміж УССР і Усходняй Галіцыяй няма граніцы, „а ёсць часовая лінія”[20]. У жніўні 1924 г. польская прэса актыўна абмяркоўвала заяву кіраўніка савецкай дэлегацыі на перамовах з Англіяй Хрысціяна Ракоўскага, якая ўтрымлівала тэзіс аб непрызнанні ўключэння Усходняй Галіцыі ў склад Польшчы[21]. Урад Польшчы звярнуўся да ўрада СССР з адмысловай нотай, у якой пратэставаў супраць дэкларацыі Ракоўскага. У ноце ў адказ НКЗС СССР заявіў: „Саюзны ўрад ніякім чынам не можа разглядаць усходнегаліцыйскае пытанне як унутраную справу Польшчы і працягвае бачыць у ім яшчэ не вырашаную міжнародную праблему”[22]. Тым самым савецкі ўрад фактычна падкрэсліў непрызнанне граніцы паміж СССР і Польшчай на галіцыйскім участку.

Гэта надзвычай хваравіта ўспрымалася ў Польшчы, правячыя колы якой лічылі вельмі важным для сваёй краіны ў геапалітычным плане валоданне Заходняй Беларуссю і Заходняй Украінай. Як справядліва адзначае ў сваім даследаванні Рыгор Лазько, уключэнне ў склад Польшчы гэтых тэрыторый давала ёй „неабходную стратэгічную прастору, звязвала з краінамі Прыбалтыкі і Румыніяй. Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна маглі стаць прыцягальнымі для народаў, якія засталіся па той бок польска-савецкай граніцы. А гэта адкрывала перспектыву змены геапалітычнай сітуацыі ў рэгіёне на карысць Польшчы”[23]. Адсюль зразумелае імкненне польскіх правячых колаў захаваць кантроль над „усходнімі крэсамі”.

Уздымаючы пытанне аб становішчы нацыянальных меншасцей у Польшчы, савецкая дыпламатыя зыходзіла з таго, як вынікае з тэлеграмы саветніка савецкага прадстаўніцтва ў Варшаве І. Лоранца ад 12 снежня 1922 г., „што самым простым і надзейным спосабам супрацьдзеяння планам лявіцы ў замежнай палітыцы, накіраванай у бок усходу, з’яўляецца аслабленне іх у крэсах. (...) аб гэтым Вам ужо пісаў у свой час т. Абаленскі”[24]. Пра тое, якое вялікае значэнне савецкае кіраўніцтва надавала аслабленню польскага ўплыву на тэрыторыі Заходняй Беларусі сведчыць стварэнне пастановай Палітбюро ЦК УКП(б) па іні-

[20] АВПРФ, ф. 04, оп. 32, п. 213, д. 52596, т. 2, л. 22.

[21] „Известия”, 1924, 19 августа, № 187 (2222).

[22] „Известия”, 1924, 26 сентября, № 220 (2255).

[23] Р. Лазько, *Ягелонская ідэя ў Польскай Рэспубліцы пасля Рыжскага міру*, „Беларускі гістарычны часопіс”, 1995, № 3, с. 26.

[24] АВПРФ, ф. 04, оп. 32, п. 211а, д. 133, л. 48.

цыятыве НКЗС 31 мая 1923 г. адмысловай камісіі ЦК УКП(б) па пытанні „Аб рабоце сярод беларусаў у Польшчы", аб чым ужо гаварылася раней[25].

Для аслаблення пазіцый Польшчы на ўсходніх ускраінах намячалася актыўна выкарыстоўваць нацыянальнае пытанне. Саветнік І. Лоранц пісаў Л. Абаленскаму вясной 1923 г. аб мэтазгоднасці з боку БССР заявіць аб зацікаўленасці ў тэрыторыях, „якія ляжаць на ўсход ад прызнанай намі граніцы Літвы". Такая заява аблягчалася тымі абставінамі, што БССР не ратыфікавала Рыжскага дагавора. У сваёй заяве беларускі савецкі ўрад павінен быў указаць, што ён не можа ратыфікаваць рыжскай граніцы з-за сістэматычных парушэнняў польскім урадам правоў беларусаў на тэрыторыі Польшчы. У названай тэлеграме прама гаворыцца пра мэты савецкай палітыкі ў адносінах да Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны: „(...) няма чаго падкрэсліваць, як важна для нас умацоўваць незадавальненне на польскіх ускраінах і ствараць там прыцягненне на карысць савецкіх рэспублік"[26].

Фактычна тыя ж мэты савецкай палітыкі на „ўсходніх крэсах" агучыў і А. Мануільскі ў выступленні па нацыянальным пытанні на III з'ездзе Камуністычнай партыі Польшчы. Перад польскімі камуністамі была пастаўлена задача выкарыстаць нацыянальнае пытанне для развалу польскай дзяржавы. Ён адзначыў, што ў рэзалюцыі II з'езда КПП правільна прызнаецца права на самавызначэнне аж да аддзялення за „ўкраінскай і беларускай часткамі сучаснай Польшчы", і далей заявіў: „Мы павінны імкнуцца расшыць па нацыянальных швах сучасную польскую дзяржаву, не даўшы ёй часу асесці і набыць устойлівасць (...)"[27].

Фактарам аслаблення польскага ўплыву на „ўсходніх крэсах" павінен быў стаць і партызанскі рух нацыянальных меншасцей, падтрымліваемы савецкім кіраўніцтвам. Пры гэтым гаворка вялася аб падрыхтоўцы і правядзенні буйных узброеных акцый супраць польскіх улад ва „ўсходніх крэсах". Штаб польскага 9-га корпуса, размешчаны ў Брэсце, у канцы сакавіка — пачатку красавіка 1923 г. адзначаў намаганні Масквы па падрыхтоўцы антыпольскага паўстання ў Заходняй Беларусі. У данясеннях камандавання корпуса ўказвалася на накіраванне савецкім бокам інструктараў на тэрыторыю Польшчы для падрыхтоўкі паўстання, а само яно намячалася на сярэдзіну мая. Пры гэтым польскія ваенныя лічылі, што яно будзе падтрымана рэгулярнымі войскамі Чырвонай Арміі і літоўскіх узброеных сіл[28].

[25] У. Ф. Ладысеў, П. І. Брыгадзін, *Паміж Усходам і Захадам...*, с. 149.
[26] АВПРф, ф. 04, оп. 32, п. 212, д. 52568, л. 38-39.
[27] А. Мануильский, *Коммунистическая партия Польши...*, с. 27, 41.
[28] ДААБВ, ф. 67, воп. 1, спр. 372, арк. 5.

У 1924 г. савецкая прэса асабліва часта пісала аб дзеяннях партызан у Заходняй Беларусі [„Известия”, 1924, 12 августа, № 182 (2217); „Известия”, 1924, 1 октября, № 224 (2259); „Известия”, 1924, 5 ноября, № 254 (2289)]. Пры гэтым СССР імкнуўся стварыць у міжнароднай супольнасці ўражанне, што партызанскі рух — гэта прамы вынік праводжанай польскімі ўладамі палітыкі на гэтай тэрыторыі. Так, намеснік генеральнага сакратара Сялянскага інтэрнацыянала Тамаш Домбаль заявіў у інтэрв’ю „Известиям”, што прычына партызанскіх дзеянняў — невыноснае становішча насельніцтва Заходняй Беларусі[29].

Усе крокі СССР, звязаныя з адстойваннем правоў беларусаў і ўкраінцаў у Польшчы, мелі адну канчатковую мэту — далучэнне Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны да савецкіх рэспублік. Дастаткова красамоўна сказаў аб гэтым у выступленні на III Усесаюзным з’ездзе саветаў у маі 1925 г. старшыня Савета Народных Камісараў Аляксей Рыкаў. Ён адзначыў: „(...) нацыянальная палітыка палякаў прама супрацьлегла нашай, і паколькі на граніцах Савецкай Беларусі ёсць польская Беларусь, а на граніцах Савецкай Украіны ёсць Заходняя Украіна, то гэтае суседства выклікае з боку нацынальных меншасцей на тэрыторыі Польшчы цягу да Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік”[30].

Уяўленне аб мэтах савецкай дыпламатыі, якіх яна хацела дасягнуць, уздымаючы пытанне аб нацыянальных меншасцях, добра ілюструе інструкцыя НКЗС СССР, якая была накіравана 2 студзеня 1925 г. савецкаму паўпраду ў Варшаве Пятру Войкаву ў сувязі з маючымі адбыцца савецка-польскімі перамовамі. Яна прадпісвала на перамовах спыніцца ў парадку дыскусіі на пытанні аб культурнай аўтаноміі для нацыянальных ускраін. Аднак далейшы тэкст інструкцыі паказвае, што Масква зусім не імкнулася садзейнічаць культурнаму развіццю беларусаў і ўкраінцаў у Польшчы. У дакуменце тлумачылася для чаго меркавалася ўзняць пытанне аб культурнай аўтаноміі: „Трэба гэта зрабіць галоўным чынам для таго, каб палякам не даваць агітацыйнага матэрыялу ў тым выпадку, калі перамовы закончацца няўдачай”. Савецкае кіраўніцтва лічыла, што ў самім пагадненні ўвогуле нічога не трэба казаць пра нацыянальныя меншасці „не толькі таму, што гэта было б непрымальна для палякаў, але, перш за ўсё, таму, што гэта было б звязана з канчатковым прызнаннем межаў і задавальненнем сустрэчных патрабаванняў палякаў”[31].

У снежні 1925 г. ішла падрыхтоўка да чарговага этапу савецка-польскіх палітычных перамоў, і П. Войкаў дасылае ў Маскву ліст са сваімі

[29] „Известия”, 1924, 2 октября, № 225 (2260).
[30] „Известия”, 1925, 15 мая, № 109 (2442).
[31] АВПРФ, ф. 04, оп. 32, п. 217, д. 52670, л. 1-4.

меркаваннямі аб іх вядзенні. Ён прапануе ўзняць перад палякамі пытанне аб выкананні артыкула 7 Рыжскага дагавора і далей падкрэслівае, што „зрабіць гэта трэба толькі дзеля гандлю, таму што на гэта Польшча наўрад ці пайшла б”[32]. Такім чынам, з дадзенага дакумента відавочна, што, ставячы перад польскім урадам пытанне аб правах нацыянальных меншасцей у Польшчы, Масква зусім не імкнулася да рэальнага выканання артыкула 7 Рыжскага дагавора. Па-першае, гэты артыкул накладаў узаемныя абавязацельствы адносна нацыянальных меншасцей у СССР і Польшчы. Па-другое, савецкае кіраўніцтва лічыла, што ўключэнне ў новы дагавор палажэнняў, якія пацвярджаюць правы беларусаў і ўкраінцаў у Польшчы, азначала б канчатковае юрыдычнае прызнанне з боку СССР усталяванай Рыжскім дагаворам польска-савецкай мяжы, а гэта супярэчыла стратэгічнай лініі савецкай палітыкі ў дачыненні да Польшчы.

Аналіз нотнай перапіскі паміж СССР і Польшчай па праблеме нацыянальных меншасцей дазваляе зрабіць выснову, што для савецкага ўрада гэтая праблема ўсё ж не мела важнага самастойнага значэння. Паказальна, што становішча нацыянальных меншасцей не было прадметам перамоў у час буйнейшых савецка-польскіх дыпламатычных кантактаў першай паловы 1920-х гадоў: візітаў у Варшаву Максіма Літвінава ў 1922 г., Г. Чычэрына ў 1922 і 1925 гадах, В. Копа ў 1923 г. Напэўна, гэтае пытанне не лічылася бакамі самым важным. Яно разглядалася савецкім урадам як інструмент аслаблення пазіцый Польшчы на прасторы Цэнтральна-Усходняй Еўропы, як сродак ціску на яе. На наш погляд, савецкі ўрад, уздымаючы час ад часу пытанне аб нацыянальных меншасцях, хацеў, па-першае, заваяваць сімпатыі ўкраінскага і беларускага насельніцтва ў Польшчы. Тым самым аслаблялася адзінства польскай дзяржавы і рыхтаваліся ўмовы для далучэння да СССР Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Па-другое, СССР імкнуўся сфарміраваць у еўрапейскай грамадскасці ўражанне аб прыгнечаным становішчы беларусаў і ўкраінцаў у Польшчы і гэтым апраўдаць сваё імкненне да перагляду польска-савецкай граніцы. У сувязі з адзначаным савецкае кіраўніцтва было зацікаўлена ў тым, каб пастаянна падтрымліваць незадавальненне нацыянальных меншасцей у Польшчы, у тым ліку і беларусаў, у дачыненні да гэтай дзяржавы. Пры гэтым актыўна выкарыстоўвалася тое, што рыжская мяжа раздзяліла беларусаў і ўкраінцаў на тых, хто пражываў на тэрыторыі савецкіх рэспублік, і тых, хто апынуўся на тэрыторыі Польшчы. Урады савецкіх рэспублік імкнуліся выступіць у ролі абаронцаў правоў тых беларусаў і ўкраінцаў, якія апынуліся ў складзе Польшчы, і зрабіць Савецкую Украіну і Са-

[32] АВПРФ, ф. 04, оп. 32 П. 217, д. 52668, л. 118.

вецкую Беларусь прыцягальнымі для іх. Канчатковая мэта гэтых намаганняў заключалася ў тым, каб перагледзець польска-савецкую граніцу 1921 г. Для пачатку неабходна было аслабіць польскую дзяржаву. Аслаблення, а магчыма і ліквідацыі незалежнай Польшчы, як апоры ўсёй Версальскай сістэмы, савецкае кіраўніцтва разлічвала дасягнуць некалькімі шляхамі, у тым ліку выкарыстоўваючы і праблему нацыянальных меншасцей. Гэтую праблему Савецкая Расія імкнулася выкарыстаць, каб перашкодзіць згуртаванню Польшчы як цэльнага дзяржаўнага арганізма і перагледзець яе граніцы.

У той жа час неабходна адзначыць, што польскі ўрад сваёй палітыкай даваў падставы, каб савецкая прапаганда сярод беларусаў і ўкраінцаў у Польшчы знаходзіла водгук. Ужо ў ходзе першага перапісу насельніцтва на занятай палякамі тэрыторыі Беларусі 80% беларусаў-католікаў былі запісаны як палякі[33]. Прынятыя ў ліпені 1924 г. у Польшчы законы рабілі практычна немагчымай адукацыю на беларускай мове для насельніцтва Заходняй Беларусі. У 1926 г. былі ліквідаваны нават прыватныя беларускія школы. 21-22 жніўня 1924 г. польскі ўрад адмыслова абмяркоўваў сітуацыю ў „крэсах усходніх”. Як сведчыць пратакол пасяджэння, каб захаваць польскі кантроль над гэтымі тэрыторыямі, стаўка рабілася выключна на рэпрэсіі. Было прынята рашэнне аб прызначэнні ваяводаю ў Навагрудак генерала і падначаленні яму ўсіх вайсковых адзінак, якія знаходзіліся на тэрыторыі ваяводства. Намячалася стварэнне корпуса ваеннай пагранічнай варты для падаўлення антыўрадавага руху ў прыгранічных раёнах Заходняй Беларусі. Урад вырашыў не дапусціць правядзення з’езда дэпутатаў сейма ад нацыянальных меншасцей, які планавалася правесці ў Пінску[34]. Неабходна адзначыць, што Польшча са свайго боку спрабавала выкарыстаць ідэю праметэізму, каб адарваць ад Расіі яе нацыянальныя ўскраіны і тым самым адсунуць яе граніцы далёка на ўсход і значна аслабіць. Аднак асаблівых поспехаў у гэтай справе палякі не дасягнулі.

[33] А. М. Кротаў, *Народ, пакінуты на волю лёсу: беларусы ў пасляверсальскай Польшчы*, [у:] Р. Р. Лазько, А. М. Кротаў, М. М. Мязга, *Беларусь у еўрапейскай палітыцы. 1918-1925 гг. Нарысы*, Гомель 2003, с. 87.

[34] ДМИСПО, т. 4, с. 318-319.

**Streszczenie**

W artykule przeanalizowano rolę problemu mniejszości narodowych w polityce radzieckiej w stosunku do Polski w latach 1921-1926. Ukazana została ewolucja tej polityki od prób wykorzystania kwestii praw Białorusinów i Ukraińców do wywierania presji na Polskę (1921 — pierwsza połowa 1924 r.) do dążenia rozwiązania problemu w ramach normalizacji stosunków radziecko-polskich (druga połowa 1924 — 1925 r.). Kierownictwo radzieckie w pierwszej połowie lat 1920. dążyło do wykorzystania problemu mniejszości narodowych do osłabienia Polski. Ostatecznym celem tej polityki było stworzenie warunków do oderwania Zachodniej Białorusi i Zachodniej Ukrainy od Polski i włączenia ich w skład ZSRR.

**Summary**

The article analyzes a role of the problem concerning national minorities in the Soviet policy towards Poland in 1921-1926. The evolution of such policy, from attempted abuse of the Belarusians and Ukrainians' rights, through exerting pressure on Poland (1921 — the first half of 1924), to endeavors made within the frames of normalization of the relations between Soviet Russia and Poland (the second half of 1924 — 1925), is presented therein. In the first half of the 1920s, Soviet leaders intended to use the problem of national minorities to weaken Poland. An ultimate aim of such policy was the creation of conditions that would allow to separate West Belarus and West Ukraine from Poland and incorporate them to the USSR.

**Mikołaj Miazha** — doktor nauk historycznych, docent, dziekan Wydziału Historii Państwowego Uniwersytetu im. Franciszka Skoryny w Homlu. Zainteresowania badawcze: polityka zagraniczna Polski, stosunki polsko-radzieckie i międzynarodowa sytacja w Europie Środko-Wschodniej w okresie międzywojenym w XX wieku.